УДК 373:930

# АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ ЯК КАНЦЭПТУАЛЬНАЯ АСНОВА ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ПРАЦЭСУ РАЗВІЦЦЯ ШКОЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

***Сяргей Паноў***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле аўтар аналізуе змястоўна-сэнсоўную эвалюцыю беларускай нацыянальнай ідэі як аснову для даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Вывучаецца магчымасць выкарыстання феномена агульнанацыянальнай ідэі ў якасці сацыяльна-педагагічнай катэгорыі. Развіцце якасцей асобы вучняў, як прадстаўнікоў сучаснай грамадзянскай нацыі, пры вывучэнні імі гісторыі Беларусі можа быць змястоўна насычана на аснове агульнанацыянальнай ідэі.

***Ключавыя словы:  агульнанацыянальная ідэя; гістарычная адукацыя***

Зварот аўтара артыкула да феномена агульнанацыянальнай ідэі абумоўлен яго навуковым інтарэсам да праблемы трансфармацыі тэарэтыка-метадалагічных падыходаў у рэфармаванніі школьнай гістарычнай адукацыі перыяду суверэннай Рэспублікі Беларусь. Эвалюцыйнае па свайму характару складванне ў сацыякультурным і міждысцыплінарным навукова-адукацыйным асяроддзі феномена агульнанацыянальнай ідэі паўплывала на дыдактычнае канструяванне зместу гісторыі Беларусі як вучэбнага прадмета з пункту гледжання фарміравання якасцей асобы вучня, як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і носьбіта каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту. Уяўляецца цікавым прасачыць, выкарыстоўваючы канцэпт агульнанацыянальнай ідэі як сацыяльна-педагагічнай катэгорыі, рэтраспектыву фарміравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі, пачынаючы з 1991 г. Для гэтага патрабуецца ахарактарызаваць магчымасць выкарыстання

агульнанацыянальнай ідэі ў якасці метадалагічнага падыходу пры вывучэнні працэсу станаўлення гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальная ідэалогія разумееца сення як ідэйны фундамент адукацыйнай сістэмы, адзінай вучэбна-выхаваўчай прасторы школы і ўстаноў вышэйшай адукацыі [1, с. 7-8]. Па меркаванні доктара педагагічных навук, прафесара А. В. Хутарскога асновай адукацыі з’яўляюцца нацыянальныя ідэі айчыннай гісторыі і культуры, якія служаць асновай для канструявання айчыннай педагогікі і дыдактыкі [10, с. 117].

Для пераводу агульнанацыянальнай ідэі з пераважна паліталагічнага аспекта ў сацыяльна-педагагічную катэгорыю варта суаднесці на міждысцыплінарнай аснове мэты (функцыянал) нацыянальна-дзяржаўнай ідэі і айчыннай сістэмы адукацыі. Калі агульнанацыянальная ідэя выконвае кансалідуючую і выхаваўчую ролю ў грамадстве, то яе магчыма інтэграваць у працэс развіцця асобы, што з’яўляецца стратэгічнай мэтай сістэмы адукацыі. У дадзеным выпадку наш погляд на гістарычную адукацыі будзе звязаны з яе накіраванасцю на развіцце вопыту тых, хто навучаецца з улікам чатырох сфер развіцця асобы: інтэлектуальнай, эмацыянальна-каштоўнаснай, волевой, фізічнай. У дадзеным выпадку будзе запатрабавана канцэптуальнае палажэнне акадэміка Расійскай акадэміі адукацыі, доктара педагагічных навук, прафесара А. М. Новікава аб адукацыі як развіцці жыццевага вопыта асобы і згаданых вышэй аспектаў развіцця яе псіхічных працэсаў [9, с. 25].

Пагадзімся з канцэптуальнай думкай А. В. Хутарскога аб тым, што, калі сэнсам і мэтай адукацыі лічыць развіцце чалавека, то з пункту гледжання нацыянальнай ідэі адукацыя чалавека есць такі яго стан і вынік, калі свае пачуцці, розум, волю і цела ен арыентуе на самарэалізацыю і самаразвіцце, адчуваючы свае прызначэнне перад самім сабой, сям’ей, Айчынай, дзяржавай [16, с. 118]. Дададзім да гэтага меркавання думку доктара псіхалагічных навук, прафесара Д. І. Фельдштейна, які падкрэслівае актуальнасць стварэння ўмоў для станаўлення індывіда як культурна-гістарычнага субъекта, які будзе ўспрымаць гісторыю як сваё мінулае і адчуваць адказнасць перад самім сабой і сваім будучым [15, с. 27].

Як слушна заўважае член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар І. А. Марзалюк любая нацыянальная ідэя адказвае на тры фундаментальныя для кожнага народа пытанні: адкуль мы? хто мы? куды мы ідзем? Пачынальнікамі нацыянальнай ідэі з’яўляюцца ўраджэнцы Беларусі студэнты Санкт–Петербургскага ўніверсітэта, народавольцы, заснавальнікі нелегальнага часопіса «Гоман», які выпускаўся ў 1884 г., Х. Ратнер і А. Марчанка. Яны першымі на тэарэтычным узроўні сфармулявалі думку аб праве беларускага народа на сваю дзяржаўнасць у форме аўтаноміі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі [5]. Пастаўленыя ў рэчышчы нацыянальнай ідэі пытанні трэба адлюстраваць ў змесце гістарычнай адукацыі.

У аспекце гістарычнай рэтраспектывы можна згадаць пра нацыянальную ідэю, сфармуляваную міністрам асветы графам С. В. Уваравым у 1833 г., калі беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Яе намінацыя гучала як «Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць». Сэнс гэтай ідэалогіі па словах С. В. Уварава заключаўся ў тым, каб «завладеть умами юношества» і ўкараніць «истинно русские охранительные начала православия, самодержавия и народности, составляющие последний якорь нашего спасения и вернейший залог силы и величия нашего общества» [ 10].

Пытанне аб выкарыстанні нацыянальнай ідэі у адукацыйных мэтах знайшло водгук у педагагічным асяроддзі. Так акадэмік РАА А. М. Новікаў суаднес катэгорыі «асоба», «грамадства», «дзяржава», згаданыя, дарэчы, у Кодэксе Рэспублікі Беларусь у вызначэнні, што такое адукацыя, з абагульняючымі паняццямі «духоўнасць», «абшчыннасць», «дзяржаўнасць», вызначыўшы іх як сутнасць цяперашняй нацыянальнай ідэі Расіі у якасці намінацыі [ 10; 11]. Духоўнасць ім разумееца, як накіраванасць асобы, народнасць – як узаемаадносіны кожнага чалавека з грамадствам, народам і як сістэма грамадскіх адносін, дзяржаўнасць – як сістэма адносін чалавека і дзяржавы, грамадства і дзяржавы.



ПолесГУ

Пачаткам усведамлення нацыянальнай ідэя як педагагічнай катэгорыі ў Рэспубліцы Беларусь можна лічыць тэарэтычны артыкул доктара гістарычных навук, прафесара А. Г. Слукі ў навукова-педагагічным часопісе «Народная асвета» у 1999 г.. У ім увага акцэнтавалася на тапалагічным аспекце нацыянальнай ідэі, які трэба рэалізаваць у практыцы выхавання асобы. Сціслая намінацыя нацыянальнай ідэя гучала, як «Мова. Нацыя. Дзяржава» [12]. Наступным крокам у тэарэтычным абгрунтаванні нацыянальнай ідэя стала яе намінацыя «Свабода. Росквіт. Дабрабыт», растлумачаная А. Г. Слукой як гістарычнае імкненне беларускага народа [13]. Сутнасць беларускай нацыянальнай ідэі ў інтэграваным выглядзе А. Г. Слука сфармуляваў, як «Свабода! Незалежнасць! Справядлівасць!», выкарыстаўшы аксіялагічныя паняцці, у каторых змяшчаецца асноўная сутнасць існавання ўсяго чалавецтва і перманентнае імкненне да іх кажнага асобнага чалавека [14].

Заява аб неабходнасці мець кансалідуючую грамадства адзіную ідэю прагучала на цырымоніі ўступлення на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў верасні 2001 г. Гэта ідэя была абазначана, як пабудова моцнай і квітнеючай Беларусі. Сістэмная праца дзяржаўных инстытутаў па канцэптуальным вызначэнні сутнасці нацыянальнай ідэі ў Рэспубліцы Беларусь распачалася ў 2003 г. Яе пачаткам можна ўмоўна лічыць Пасланне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да беларускага народа і парламента, дзе дадзеная праблематыка адзначалася ў кантэксце канцэптуальнай, але не распрацаванай [ 3, с. 5].

Разуменне нацынальнай ідэі у сукупнасці паняццяў «Радзіма. Праца. Духоўнасць» выказаў доктар гістарычных навук, прафесар Л. Н. Ціханаў, выкарыстаўшы фундаментальныя катэгорыі, што абазначаюць сутнасць беларускай нацыі [17]. Такі погляд тым больш нам цікавы, бо прыналежыць асобе, якая займала пасаду рэктара Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Намінацыя беларускай нацыянальнай ідэя «Мы – беларусы» была выкарыстана доктарам палітычных навук, прафесарам У. А. Мельнікам на аснове паэтычнай творчасці Янкі Купалы як дэкларацыя аб самаўсведамленні беларусамі сябе ў якасці асобнага народа [ 6, с.108 – 111]:

«А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
– Беларусы …
А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
– Людзьмі звацца».

У. А. Мельнікам у якасці лагічнага працягу сваіх разваг стала вызначэнне фармулеўкі дэвіза беларускай дзяржавы «Бацькаўшчына, братэрства, працавітасць». У гэтым вызначэнні яскрава прасочваецца агульны сэнс беларускай нацыянальнай ідэі, які заключаецца ў афармленні і ўмацаванні беларускай дзяржаўнасці ў выглядзе Рэспублікі Беларусь [ 7, с. 179].

Новым метадалагічным падыходам да характарыстыкі носьбіта беларускай нацыянальнай ідэі, якім з'яўляецца сучасная беларуская нацыя, стала яе вызначэнне У. А. Мельнікам як палітычнай і грамадзянскай супольнасці [8]. Канцэптуальным трэба лічыць палажэнне, агучанае Главой дзяржавы аб тым, што мы складаем адзіную гістарычную супольнасць – беларускі народ і кожны з нас павінен усведамляць, што ен – перш за-ўсе грамадзянін Рэспублікі Беларусь, а потым ужо – беларус, рускі, украінец, яўрэй, татарын і г.д. [4, с. 3].

Уяўляецца магчымым абазначыць эвалюцыю ў разуменні сэнса беларускай нацыянальнай ідэі ад пераважна этна-культурнага да дзяржаўна-палітычнага складніку і вызначэння яе як агульнанацыянальнай, што аб'ядноўвае ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь, незалежна ад іх нацыянальнасці. Агульнанацыянальная (нацыянальна-дзяржаўная) ідэя аб'ядноўвае грамадства па прыкмеце грамадзянскасці, грунтуецца на ўсведамленні народам сваёй дзяржаўнасці і першаснасці нацыянальных інтарэсаў.

Варта таксама ўлічыць меркаванне Кіраўніка дзяржавы, выказанае на калоквіўме са студэнтамі Магілеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова ў кастрычніку 2013 г. па пытанні вызначэння нацыянальнай ідэі, контуры якой ужо адчуваюцца. Было адзначана, што ў канцэнтраваным выглядзе, агульнанацыянальная ідэя яшчэ чакае свайго выяўлення [2].

Такім чынам, прыведзеныя вышэй эвалюцыйныя змест і сэнс агульнанацыянальнай ідэі магчыма выкарыстаць для яе характарыстыкі як сацыяльна-педагагічнай катэгорыі, што патрабуе ўжывання междысцыплінарнага сінтэзу. Актуалізацыя сучаснага пакалення вучняў і іх якасцей асобы як прадстаўнікоў грамадзянскай нацыі патрабуе стварыць крытэрыяльную базу для даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, зыходзячы як з яе суб’ектаў, так і з яе зместу. Можна адзначыць, што этнакультурная дамінанта, якая першапачаткова пераважала ў змесце нацыянальнай ідэі, што экстрапаліравалася на змест навучання гісторыі Беларусі, паступова трансфарміруецца ў пераважаючы дзяржаўна-палітычны складнік у змесце айчыннай школьнай гістарычнай адукацыі. Прынцыповым момантам у дыдактычным канструяванні зместу гістарычнай адукацыі паступова стаў феномен суверэннай беларускай дзяржаўнасці. У педагагічнай тэорыі і практыцы з’явілася канцэптуальнае палажэнне аб нацыянальнай ідэі як магчымай аснове для канструявання зместу адукацыі.


1. Дорошко, О.М. Организация воспитательного пространства университета : пособие по организации воспитательной работы в вузе / О. М. Дорошко, Т. М. Прудко, Е. С. Потько. – Гродно : ГрГУ, 2008. – 347 с.
2. Коллоквиум в Могилеве // СБ: Беларусь сегодня. – 2013. – 18 октября. – С. 1 – 2.
3. Лукашенко, А. Г. Мы достигнем поставленных целей! Обращение Президента Республики Беларусь к белорусскому народу и парламенту / А. Г. Лукашенко // СБ. Беларусь сегодня. – 2003. – 17 апреля. – С. 3 – 5.
4. Лукашенко, А. Г. Край, сердцем хранимый. Выступление Президента Республики Беларусь на встрече с студентами и преподавателями Белорусского государственного университета / А. Г. Лукашенко // СБ: Беларусь сегодня. – 2008. – 14 февраля. – С. 2 – 3.
5. Марзалюк, И. А. А хто там ідзе? / И. А. Марзалюк // СБ. Беларусь сегодня. – 2014. – 21 июня.
6. Мельник, В. А. Государственная идеология Республики Беларусь: концептуальные основы / В. А. Мельник; Науч. ред. П. Г. Никитенко. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Тесей, 2003. – 240 с.
7. Мельник, В.А. Белорусская национальная идея: политологический аспект / В. А. Мельник // Политология и идеология. – 2007. – № 1. – С. 176 – 184.
8. Мельник, В. А. Современный словарь по политологии / В. А. Мельник. – Минск : Книжный Дом, 2004. – С. 264 – 265.
9. Новиков, А. М. Основания педагогики. Пособие для авторов учебников и преподавателей / А. М. Новиков. – М. : Издательство «Эгвес», 2010. – 208 с.
10. Новиков, А. М. России необходима национальная идея [Электронный ресурс] / А. М. Новиков. – Режим доступа : http://www.anovikov.ru/artikle/ros_nac_id.html. – Дата доступа : 14.08.2018.
11. Проект Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О научной деятельности» и Кодекс Республики Беларусь об образовании» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://forumpravo.by/forums/npa.aspx?forum=15&topic=8164. – Дата доступа: 17.02.2017.
12. Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя ў педагагічных вобразах / А. Г. Слука // Народная асвета. – 1999. – № 9. – С. 3 – 8.
13. Слука А. Г. Нацыянальная ідэя: сістэмны аналіз праблемы / А. Г. Слука. –. Мінск: НІА; Мазыр : Белы вецер. 2001. – 158 с.
14. Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя: шлях народа (генезіс праблемы) / А. Г. Слука. – Минск : РІВШ, 2005. – 428 с.
15. Фельдштейн, Д. И. Взаимосвязь теории и практики в формировании психолого-педагогических оснований организации современного образования / Д. И. Фельдштейн // Адукацыя і выхаванне. – 2011. – № 7. – С. 19 – 29.




ПолесГУ

16. Хуторской, А. В. Дидактика : Учебник для вузов. Стандарт третьего поколения / А. В. Хуторской. – СПб. : Питер, 2017. – 720 с.
17. Ціханаў, Л. Н. «Радзіма. Праца. Духоўнасць» – падмурак нацыянальнай ідэі / Л. Н. Ціханаў // Настаўніцкая газета. – 2002. – 19 лютага. – С. 2.

ПолесГУ